ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА

БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 30 (2004) ● Чацвер, 30 кастрычніка 1975 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

**29 КАСТРЫЧНІКА — ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ КАМСАМОЛА**

«БЫЦЬ ЧЛЕНАМІ САЮЗА МОЛАДЗІ ЗНАЧЫЦЬ ВЕСЦІ СПРАВУ ТАК, КАБ АДДАВАЦЬ СВАЮ ПРАЦУ, СВАЕ СІЛЫ НА АГУЛЬНУЮ СПРАВУ. ВОСЬ У ГЭТЫМ ЗАКЛЮЧАЕЦЦА КАМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ. ТОЛЬКІ Ў ТАКОЙ ПРАЦЫ ПЕРАТВАРАЕЦЦА МАЛАДЫ ЧАЛАВЕК АБО ДЗЯЎЧЫНА Ў САПРАЎДНАГА КАМУНІСТА. ТОЛЬКІ Ў ТЫМ ВЫПАДКУ, КАЛІ ЯНЫ ГЭТАЙ ПРАЦАЙ ЗМОГУЦЬ ДАСЯГНУЦЬ ПРАКТЫЧНЫХ ПОСПЕХАЎ, ЯНЫ СТАНОВЯЦЦА КАМУНІСТАМІ».

У. І. ЛЕНІН.

# РАПАРТУЕ КАМСАМОАІЯ БДУ

**З ДАКЛАДА САКРАТАРА КАМІТЭТА КАМСАМОЛА БДУ У. А. НАВУМОВІЧА**



За два гады, прайшоўшыя пасля XXV універсітэцкай справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі, камсамольская арганізацыя БДУ імя У. І. Леніна вырасла з 10 136 да 10 447 членаў ВЛКСМ.

На XVII з'ездзе ВЛКСМ камсамольскую арганізацыю універсітэта прадстаўляла ленінскі стыпендыят студэнтка філалагічнага факультэта Любоў Тарасюк.

Дэлегатамі XXV з'езда ЛКСМБ былі сакратар камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна кандыдат філалагічных навук У. А. Навумовіч і Л. Тарасюк.

Летнюю экзаменацыйную сесію 1974—1975 навучальнага года здалі толькі на «выдатна» 1097 студэнтаў, на «добра» і «выдатна» — 4245.

17 выдатнікаў вучобы і актыўных грамадскіх дзеячоў з'яўляюцца імяннымі стыпендыятамі. Стыпендыю імя К. Маркса атрымліваюць 2 студэнты, імя У. І. Леніна — 11, імя М. І. Калініна — 1, імя Джона Бернала — 1, імя Я. Купалы — 1, імя Я. Коласа — 1.

Больш 200 студэнтаў універсітэта за выдатную вучобу і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ўзнагароджаны значком ЦК ВЛКСМ і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР «За выдатную вучобу».

Звыш 7 тысяч студэнтаў з'яўляюцца членамі студэнцкага навуковага таварыства. На факультэтах, пры кафедрах у НДІ ПФП, вылічальным цэнтры і пры навукова-даследчых лабараторыях створаны і паспяхова працуюць 158 навуковых гурткоў і семінараў. Ва універсітэце працуюць 7 студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый і вылічальных цэнтраў.

На XXXII студэнцкай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 105-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, было заслухана 1414 дакладаў.

У апошнія гады лаўрэатамі усесаюзных конкурсаў сталі 45 студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна.

У справаздачны перыяд адбыліся сумесныя пасяджэнні кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў і камітэта камсамола універсітэта з павесткамі дня: «Аб рабоце камсамольскага бюро гістарычнага факультэта па арганізацыі вывучэння гісторыі КПСС студэнтамі першага і другога курсаў» і «Аб рабоце камсамольскага бюро філалагічнага факультэта па арганізацыі самастойнага вывучэння студэнтамі твораў класікаў марксізму-ленінізму ў ходзе Усесаюзнага Ленінскага заліку «Рашэнні XXIV з'езда КПСС—у жыццё!».

Пытанні эстэтычнага і маральнага выхавання студэнтаў з'яўляюцца найбольш актуальнымі на сучасным этапе у сістэме камуністычнага выхавання моладзі. На сумесным пасяджэнні савета універсітэта, парткома і грамадскіх арганізацый разглядаліся і абмяркоўваліся гэтыя пытанні.

Праведзена нарада партыйна - камсамольскага актыву БДУ імя У. І Леніна з павесткай дня «Аб удасканаленні форм і метадаў маральнага выхавання студэнтаў».

Далёка за межамі Беларусі вядомы народныя калектывы мастацкай самадзейнасці універсітэта. Народны ансамбль танца «Крыжачок» выступаў у ПНР, НРБ, ГДР. Часта бываюць у калгасах і саўгасах, на заводах і фабрыках, у воінаў Савецкай Арміі народны аркестр народных інструментаў, народная харавая капэла, студэнцкі драматычны тэатр.

Шэфская работа — ударная справа камсамольскай арганізацыі БДУ. 37 педатрадаў працуюць у школах горада і вёскі, камсамольцы універсітэта шэфствуюць над 14 домакіраўніцтвамі горада-героя Мінска.

З 11 сакавіка па 11 красавіка 1974 года камітэт камсамола БДУ правёў месячнік шэфскай работы, праведзена дэкада шэфства над прафесіянальна-тэхнічнымі вучылішчамі. Студэнты Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна шэфствуюць над 11 ПТВ.

Шэфскую работу вядуць звыш трох тысяч студэнтаў.

Байцамі студэнцкіх будаўнічых атрадаў універсітэта у працоўным семестры-74 былі 1870 чалавек, у працоўным семестры-75 — 1920 чалавек. У 1974 годзе было асвоена капіталаўкладанняў на суму 3800 тысяч рублёў, у 1975 годзе—4400 тысяч рублёў.

У 1975 годзе у студэнцкіх будаўнічых атрадах працаваў 71 замежны студэнт, якія вучацца у БДУ імя У. І. Леніна.

Лепшымі студэнцкімі будаўнічымі атрадамі універсітэта за апошнія гады прызнаны: СБА імя Героя Савецкага Саюза В. І. Казлова (філалагічны факультэт, камандзір атрада Людміла Агароднік) і СБА імя Ленінскага камсамола (гістарычны факультэт, камандзір атрада Уладзімір Карагін).

Шырокі водгук сярод камсамольцаў універсітэта знайшоў зварот Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева да байцоў студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Камсамольская арганізацыя БДУ імя У. І. Леніна рапартавала Цэнтральнаму Камітэту ВЛКСМ аб працоўных дасягненнях зводнага студэнцкага будаўнічага атрада універсітэта у завяршальным годзе дзевятай пяцігодкі.

Напярэдадні 30-годдзя Перамогі савецкага народа у Вялікай Айчыннай вайне камсамольцы Белдзяржуніверсітэта выступілі ініцыятарамі пачыну «30-годдзю Перамогі — 30 ударных дзён!». Месяц адпрацавалі студэнты на пускавых будаўнічых аб'ектах горада-героя Мінска.

У перыяд падрыхтоўкі да 30-годдзя Перамогі студэнты універсітэта прынялі актыўны ўдзел у аперацыі «Перамога». Добрай традыцыяй сталі урокі мужнасці і паходы па месцах баявой славы савецкіх воінаў і партызан.

У 30-ю гадавіну Перамогі савецкага народа у Вялікай Айчыннай вайне ва універсітэцкім гарадку адбылося адкрыццё мемарыяльнага Знака выкладчыкам, супрацоўнікам і студэнтам Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, загінуўшым у гады вайны.

У маі 1975 года камсамольцы універсітэта зрабілі агітпрабег па маршруту Мінск — Масква— станцыя Сходня, прысвечаны юбілею Перамогі. На станцыі Сходня Кастрычніцкай чыгункі у гады вайны працаваў універсітэт.

Камсамольскай арганізацыі універсітэта адной з першых у рэспубліцы быў аказаны высокі гонар пачаць у сакавіку 1975 года абмен камсамольскіх дакументаў.

За выдатную вучобу і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці сакратары камсамольскіх арганізацый філалагічнага факультэта і ФПМ Людміла Агароднік і Павел Гаранін сфатаграфаваны каля святыні савецкага народа —Сцяга Перамогі.

Звання лаўрэатаў прэміі Ленінскага камсамола Беларусі ў галіне навукі і тэхнікі ўдастоены маладыя вучоныя універсітэта Міхаіл Дзямчук і Ігар Малевіч.

Камсамольская арганізацыя БДУ прыняла актыўны ўдзел у правядзенні III фестывалю дружбы савецкай і балгарскай моладзі. Ва універсітэце адбылася сустрэча з ганаровым госцем фестывалю, членам Палітбюро БКП, двойчы Героем Сацыялістычнай Працы НРБ, лаўрэатам міжнароднай Ленінскай прэміі «За умацаванне міру паміж народамі», старшынёй Усенароднага камітэта балгара-савецкай дружбы Цолай Драгойчавай і маладымі балгарскімі пісьменнікамі і паэтамі.

У гасцях у выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў уіверсітэта былі праслаўленыя савецкія лётчыкі-касманаўты Герой Савецкага Саюза генерал-маёр авіяцыі Г. С. Цітоў і член ЦК ВЛКСМ двойчы Герой Савецкага Саюза падпалкоўнік П. І. Клімук.

Клуб інтэрнацыянальнай дружбы «Планета» падтрымлівае цесныя сувязі са студэнтамі Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера (ГДР), Сафіскага універсітэта імя К. Ахрыдскага (НРБ), Люблянскага універсітэта (СФРЮ) і раду вышэйшых навучальных устаноў ПНР.

Напярэдадні 105-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна быў праведзены тыдзень інтэрнацыянальнай дружбы, у якім прынялі удзел члены КІДаў ВНУ і прадпрыемстваў горада Мінска, а таксама члены КІДаў Тбіліскага, Кішынёўскага і Тартускага універсітэтаў.

Дэканатам па навучанню замежных студэнтаў і клубам «Планета» праведзены фестываль мастацкай творчасці замежных студэнтаў, прысвечаны 30-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

За справаздачны перыяд камітэт камсамола універсітэта прыняў маладзёжныя дэлегацыі з НРБ, ГДР, Кубы, ПНР, СРР, ЧССР, Аўстрыі, Аргенціны, Вялікабрытаніі, Венесуэлы, Канады, Коста-Рыкі, Мексікі, Нарвегіі, Партугаліі, ЗША, Францыі, ФРГ і іншых краін.

# ПА БДУ

**27 кастрычніка у БДУ адбылося пасяджэнне савета, на якім абмяркоўваліся вынікі прыёму студэнтаў у 1975 годзе і задачы па арганізацыі прыёму ў наступным годзе. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў адказны сакратар прыёмнай камісіі Г. А. Браніцкі.**

**Аб стане і мерах па далейшаму паляпшэнню ваеннай падрыхтоўкі і ваенна-патрыятычнага выхавання студэнтаў паведаміў у сваім дакладзе начальнік ваеннай кафедры Б. М. Глазкоў.**

* * *

**26 кастрычніка у парку Перамогі адбыўся фінал асенняга кросу па праграме XXIV спартакіяды БДУ.**

* * *

**22 кастрычніка адбыўся партыйны сход гаспадарчай часткі БДУ.**

**З дакладам на сходзе выступіў начальнік аддзела гаспадарчай эксплуатацыі С. М. Касячэнка. Ён паведаміў сходу аб якасці капітальнага і сярэдняга рамонту у БДУ і аб задачах камуністаў у гэтай справе.**

* * *

**30 кастрычніка адбыўся партыйны сход геаграфічнага факультэта. На ім было разгледжана пытанне: «Аб выкананні пастановы партыйнага сходу ад 14 лістапада 1974 года «Аб выніках правядзення грамадска - палітычных практык у 1973—1974 навучальным годзе і задачах партыйнага бюро і камітэта камсамола па іх далейшаму ўдасканаленню». На сходзе з дакладам выступіла дацэнт факультэта, намеснік сакратара партбюро Л. А. Паўловіч.**

# ВЫДАТНЫЯ СПРАВЫ— У ПАДАРУНАК З'ЕЗДУ

На канферэнцыі быў зачытаны рапарт байцоў СБА універсітэта камсамольскай канферэнцыі.

Мы, байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў, гаворыцца у рапарце, дакладваем, што за два апошнія працоўныя семестры намі выкананы аб'ём будаўнічых работ на суму 8 мільёнаў 200 тысяч рублёў. Гэта наш працоўны падарунак XXV з'езду КПСС.

Працоўную школу у СБА толькі за апошнія два гады прайшло каля 4 тысяч чалавек. Разам з намі на будоўлях завяршальнага года пяцігодкі працавалі замежныя студэнты, якія навучаюцца ва універсітэце.

З хваляваннем і гордасцю ўспрынялі мы пісьмо Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева байцам Усесаюзнага студэнцкага будаўнічага атрада. Партыя і народ заўжды давяралі камсамолу важныя і адказныя справы. І сёння мы звяртаемся да ўсёй камсамоліі універсітэта з заклікам з гонарам апраўдаць высокае давер'е Радзімы. Разам з камсамольцамі і моладдзю краіны мы будзем актыўна змагацца за дастойную сустрэчу XXV з'езда КПСС, за ганаровае права паднісаць рапарт Ленінскага камсамола з'езду роднай Камуністычнай партыі.



**У лабараторыі оптыкі вядуць даследаванні старшы выкладчык кафедры агульнай фізікі Л. І. Варапай і аспірант гэтай жа кафедры А. П. Клешчанка.**

Фота Г. Марозава.

# ГАВОРАЦЬ ДЭЛЕГАТЫ

*У час канферэнцыі нашы няштатныя карэспандэнты узялі у дэлегатау рад інтэрв'ю. Прадстаунікі камсамольскіх арганізацый адказалі на два пытанні:*

**1. З чым вы, вашы таварышы прыйшлі на канферэнцыю!**

**2. Вашы праблемы сёння!**



**Л. ТАРАСЮК.**

*(Філалагічны факультэт).*

1. Гэты год быу для мяне годам напружанай працы. Як дэлегат XVII з'езда ВЛКСМ я выступала на шматлікіх камсамольскіх сходах, вечарах, Ленінскіх уроках, выступала у студэнцкіх аудыторыях, у школах, ГПТВ, навукова-даследчых інстытутах. Была удзельніцай VII семінара творчай і навуковай моладзі. Цяпер вось, скончыушы універсітэт, паступіла у аспірантуру.

2. Па-мойму, галоуная праблема—гэта маральная адказнасць за кожны свой учынак, за кожную справу. Быць наперадзе—цяжка, таму што на цябе усе рауняюцца. І атмасфера у групе залежыць ад таго, хто ты—студэнт-актывіст, якое у цябе маральнае аблічча.



**А. КАЛІНКА.**

*(Фізічны факультэт).*

1. Я з'ауляюся адказным за культурна-масавы сектар у камітэце камсамола факультэта. Таму больш за усё мне запомніліся, канешне, дні фізіка. Такое мерапрыемства на фізфаку было праведзена упершыню. Атрымалася проста здорава. І яшчэ адна вялікая радасць: першае месца факультэцкай агітбрыгады у аглядзе-конкурсе.

2. Асабіста у мяне праблем няма. Мяне можна назваць шчаслівым студэнтам. Яшчэ б — мне хапае 24 гадзін у суткі для усіх сваіх спрау.



**А. РАЗАНАЎ.**

*(Гістарычны факультэт).*

1. Наша камсамольская арганізацыя дастойна сустрэла 30-годдзе Перамогі савецкага народа над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Вельмі усхвалявала нас сустрэча з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, выкладчыкамі факультэта.

2. Я лічу, што студэнт-актывіст перш за усё павінен дабівацца таго, каб ні адзін камсамолец не стаяу у баку ад грамадскай работы...

**Матэрыялы з камсамольскай канферэнцыі падрыхтавала група студэнтау факультэта журналістыкі.**

**Фота А. ЦЫГУЛЁВА, А. БАСАВА.**

# ПУЛЬС КАМСАМОЛЬСКАГА ЖЫЦЦЯ

**(З ВЫСТУПЛЕННЯ НАМЕСНІКА САКРАТАРА КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ГІСТФАКА А. МАСЕЙКІ).**

Развіццё грамадскай актыўнасці і ініцыятывы, самаадданасці студэнцкай моладзі — галоуная задача камсамольскай арганізацыі ВНУ.

Мы часам гаворым: няма людзей для правядзення мерапрыемства, выканання камсамольскага даручэння. Ці так гэта? Не. Рэзервы у нас вялікія.

Яшчэ у студзені — лютым гэтага года, рыхтуючыся да абмену камсамольскіх дакументау, мы правялі субяседаванне больш чым з 250 камсамольцамі гістарычнага факультэта і атрымалі цікавы матэрыял для разважанняу. Многія рабяты да паступлення ва універсітэт вялі грамадскую работу у школах, на прадпрыемствах, у калгасах і г. д. У нас жа яны робяць вельмі мала. Чаму? «Не звярталіся да нас», — гавораць адны. «Няёмка было самому прапаноуваць свае паслугі»,—другія. «Баяуся, што не спраулюся», — трэція.

У чым тут наша недапрацоука? Не дайшлі некалі да кожнага першакурсніка, не пагаварылі з ім, не пасталіся знайсці яму занятак па душы. Але многае можна яшчэ зрабіць і на апошніх курсах.

Важна не толькі даць даручэнне, але і навучыць выконваць яго. Для гэтага на факультэце мы стварылі школу камсамольскага актыву. Паставілі задачу: праводзіць заняткі так, каб было не толькі карысна, але і цікава. Да другога семестра мінулага навучальнага года гэту задачу у многім выканалі: на заняткі у школу пачалі прыходзіць рабяты нават з іншых факультэтау.

Працуючы, на мой погляд, увесь час трэба дабівацца таго, каб асноуная крыніца камсамольскага жыцця біла не у камітэтах камсамола факультэтау, а на курсах і у групах. Добра у гэтых адносінах зарэкамендавала сябе такая форма работы, як метад курсавых, групавых заданняу, даручэнняу. Гэта дазваляе больш эфектыуна размеркаваць грамадскія даручэнні, пазбавіцца ад фармалізму у іх выкананні.

Размеркаваушы даручэнні, нельга забываць аб іх. Неабходна заусёды кантраляваць іх выкананне. Дысцыпліна адыгрывае тут вельмі важную ролю, бо густ да грамадскай работы не узнікае адразу.

У павышэнні грамадскай актыунасці студэнтау значную ролю адыгрывае добра прадуманая сістэма заахвочванняу. Вельмі часта мы гэта недаацэньваем.

Яшчэ зусім нядауна універсітэт фарміравау два інтэрнацыянальныя СБА па 20 чалавек. Зараз—толькі адзін (15—17 чалавек). Чаму? Незразумела. Пазнаёміцца з жыццём юнацтва брацкіх сацыялістычных краін, абмяняцца вопытам камсамольскай работы, студэнцкага будаунічага руху, завязаць кантакты — усё гэта мае вялікае значэнне як для нас, так і для прымаючага боку.

# МАСАВАЯ ФОРМА КАНТРОЛЮ

**(З ВЫСТУПЛЕННЯ СТАРШЫНІ ШТАБА «КП» УНІВЕРСІТЭТА П. БРЫГАДЗІНА).**

«Камсамольскі пражэктар» універсітэта складаецца са штаба «КП», факультэцкіх штабау, пастоу «КП» на курсах, карэспандэнтау у групах.

Адразу ж пасля вybрання штаб «КП» універсітэта правёу вучобу актыву. Неаднойчы перад «пражэктарыстамі» выступалі прадстаунікі ГНК БДУ, лепшых факультэцкіх штабау «КП». Але ні на адным з іх не прысутнічалі прадстаунікі «КП» фізічнага факультэта і ФПМ.

Асноунымі формамі работы «КП» з'яуляліся рэйды, праверкі, агляды. Штабам «КП» універсітэта за справаздачны перыяд былі правераны умовы працы, быту камсамольцау друкарні выдавецтва БДУ, стан вучэбных памяшканняу і інвентару карпусоу універсітэта. Па даручэнню ГНК праверылі размеркаванне стыпендыяльных фондау на радзе факультэтау. Вынікі рэйдау і праверак абмяркоуваліся на пасяджэннях штаба, паведамляліся ГНК, камітэту камсамола, зацікауленым асобам і арганізацыям.

Універсітэцкі штаб «КП» шмат увагі удзяляу аналізу працы факультэцкіх штабау «Камсамольскага пражэктара», абагульненню вопыту лепшых.

Але разам з тым былі і недапрацоукі. Так, некалькі адарванымі ад штаба універсітэта аказаліся штабы «Камсамольскага пражэктара» НДІ ПФП, біялагічнага, хімічнага факультэтау. Недастаткова патрабавальным аказауся штаб «КП» універсітэта да штаба «КП» фізікау, які часта ігнаравау нашы рашэнні.

Былі няудачы, былі і станоучыя вынікі. Поспех работы «КП» у многім вызначаецца тым, наколькі трывалы кантакт «пражэктарыстау» з ГНК факультэта, прафсаюзам, наколькі камітэт камсамола аказвае дапамогу «Камсамольскаму пражэктару». У гэтых адносінах заслугоувае пахвалы гістарычны факультэт.

«Камсамольскі пражэктар» —адна з форм народнага кантролю, форма масавая. Між тым амаль на усіх факультэтах вельмі слабая сувязь штаба з пастамі «КП». Галоуная прычына, відаць, заключаецца у тым, што члены пастоу працавалі як бы па-за бюро камсамольскіх арганізацый курсау, груп. Таму новаму штабу «КП» разам з камітэтамі камсамола факультэтау неабходна увесці у практыку рэгулярнае абмеркаванне бягучай дзейнасці як факультэцкага штаба «КП», так і яго падраздзяленняу.

# З ДУМКАЙ АБ ЗАЎТРАШНІХ СТУДЭНТАХ

**(З ВЫСТУПЛЕННЯ ДЭКАНА ГРАМАДСКІХ ПАДРЫХТОЎЧЫХ КУРСАЎ Д. СМАГІНАЙ.).**

Прафарыентацыя — адзін з этапау фарміравання адносін чалавека да сваёй працы. Памылкова лічыць, што потым, калі юнак або дзяучына прыступяць да сваёй дзейнасці, прыйдзе і любоу да яе. Неабходна, каб яшчэ у школе чалавек цвёрда выбрау сваю сцяжынку, а не ішоу у інстытут па прынцыпу «усё роуна, абы дыплом».

І вось іменна тут у камсамолі ВНУ шырокае кола дзейнасці. Форм работы па прафарыентацыі у камсамольскай арганізацыі універсітэта шмат: школы юных, выезды да падшэфных з лекцыямі, канцэртамі, прапаганда спецыяльнасцей байцамі будатрадау і г. д. Аднак не усё часам ідзе так гладка, як хацелася б. Мы арганізавалі школы юных у Дзяржынскім і Стаубцоускім раёнах, з'ездзілі некалькі разоу туды, а на большае не хапае сродкау.

У гэтым годзе адбудзецца першы выпуск студэнтау, якія некалі пачыналі займацца на падрыхтоучым аддзяленні. Гэта для нас знамянальная падзея. Хачу толькі сказаць, што камітэту камсамола універсітэта трэба быць больш уважлівым да падрыхтоучага аддзялення, прыцягваць слухачоу да грамадскай дзейнасці.

Ва універсітэце працуюць і грамадскія падрыхтоучыя курсы. Гэта, як вы ведаеце, адзіныя курсы у рэспубліцы. Нягледзячы на шырокую прапаганду іх сярод арганізацый іншых ВНУ, мы застаемся адны, што стварае пэуныя цяжкасці у рабоце. Мы не можам прыняць усіх жадаючых, гэта па-першае. Па-другое, вялікая колькасць слухачоу паступае потым не да нас, а у іншыя ВНУ. Мы рыхтуем абітурыентау для паступлення у радыёфізічны, медыцынскі, політэхнічны інстытуты.

У мінулым годзе дэканат курсау паспрабавау арганізаваць свой філіял на ВТА «Інтэграл». Спроба у цэлым аказалася удалай. Аднак і тут былі свае хібы. Не зусім добра абстаяць справы з падборам выкладчыкау, цяжка дагаварыцца з аспірантамі, знайсці месца для заняткау.

Наша задача, задача усяго камітэта камсамола — выправіць недахопы, намеціць новыя рубяжы.

1. У мінулым навучальным годзе мы на высокім узроуні правялі грамадска-палітычную атэстацыю. Іменна гэта падзея запомнілася мне больш за іншыя. Ніхто не застауся у баку, напэуна, таму, што справа была вельмі блізкая усім: гаворка ішла пра калектыу.

2. Працягваю сваю думку. На камсамольскіх сходах я убачыу, як вырашаецца праблема актыунасці-пасіунасці. Іменна гэтае пытанне хвалюе студэнта-актывіста, мяне асабіста. Акрамя таго, перада мной як спартсменам паустае праблема каардынацыі працы спартыунага бюро і камітэта камсамола.



**М. АНЦІПАЎ.**

*(Механіка-матэматычны факультэт).*

**У. САС.**

*(Біялагічны факультэт).*

1. У факультэцкім камітэце камсамола я адказваю за акадэмсектар. Работа сектара — своеасаблівае адлюстраванне работы усёй камсамольскай арганізацыі факультэта. Магу сёння сказаць, што баявітасць камсамольскай арганізацыі біяфака у параунанні з мінулым годам значна узрасла. Гэтаму садзейнічала добрая работа камісіі па грамадска-палітычнай практыцы, упарадкаванне асабістых планау, кантроль за іх выкананнем.

2. Асабіста для мяне год знамянальны тым, што я стау па-новаму адносіцца да вучобы.

**В. РОШЧЫН.**

*(Факультэт журналістыкі).*

**1. Мінулы год знамянальны для мяне тым, што я упершыню удзельнічау у трэцім працоуным семестры. Уражанні засталіся хвалюючыя. Хто не згодзіцца з тым, што будатрад — сапраудная выпрабаванне усіх якасцей студэнта! Рад, што гэта выпрабаванне я вытрымау.**

**2. Я лічу, у актывіста ёсць адзіная хвалюючая праблема: грамадская актыунасць камсамольцау, усіх, без выключэння. Незаспакоенасць, непаседлівасць — гэтыя якасці я хацеу бы бачыць у кожнага камсамольца.**

# СБА: ПРАБЛЕМЫ, МЕРКАВАННІ

**(З ВЫСТУПЛЕННЯ НАМЕСНІКА САКРАТАРА КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ФІЛФАКА, КАМІСАРА СБА М. ЦІЦЯНКОВА).**

Вышэйшая школа прапаноувае студэнтам дзённага навучання мноства форм практычнай дзейнасці для выяулення і развіцця самастойнасці і творчасці. Сярод усіх гэтых форм асабліва трэба выдзеліць студэнцкую будоулю.

У гэтым годзе Усесаюзны студэнцкі будаунічы атрад, заканчваючы сваю пяцігодку, унёс у скарбонку яшчэ адзін, пяты мільярд рублёу асвоеных капіталаукладанняу. Толькі адзін СБА БДУ «Буравеснік» імя В. І. Казлова, працуючы пяць год у Гомельскай вобласці на меліярацыі, асвоіу 323,5 тыс. рублёу; рукамі студэнтау замацавана звыш 50 км меліярацыйнага канала.

Іменна тут, у студэнцкай камуне, юнацтва правярае сябе на вернасць традыцыям старэйшага пакалення, вучыцца па-гаспадарску рашаць узнікаючыя праблемы і пытанні, выхоуваць у сабе камуністычныя адносіны да працы. Аднак мы часам не звяртаем увагі на удзел студэнтау у неарганізаваных, «дзікіх» атрадах. Пытанне аб «дзікіх» атрадах абмяркоувалася на адной з нарад камсамольскага актыву універсітэта. Мы, студэнты-будаунікі, лічым удзел камсамольцау універсітэта у «дзікіх» атрадах парушэннем камсамольскай дысцыпліны, дыскрэдытацыяй студэнцкага будаунічага руху.

Трэці працоуны семестр — гэта не толькі студэнцкія мільярды. Гэта і вялікая агульнапалітычная, культурна-масавая работа на месцах дыслакацыі. Напрыклад, СБА «Буравеснік» імя В. І. Казлова за пяць працоуных семестрау дау каля 60 канцэртау.

Але часам некаторыя камандзіры і камісары не разумеюць тых задач, а галоунае, адказнасці, якая ускладаецца на іх. Час ужо ламаць старыя традыцыі, калі вучобу камандзірау і камісарау праводзілі прадстаунікі абласнога і рэспубліканскага штабау. Іх даклады і лекцыі можна замяніць выступленнямі камандзірау ці камісарау, якія па некалькі разоу былі у саставе СБА і якім ёсць аб чым расказаць і ёсць што практычна паказаць.

Завяршылася студэнцкая пяцігодка. Камсамольцы універсітэта па арганізацыі працоунага семестра выйшлі разам з БПІ пераможцамі у сацспаборніцтве у вобласці. Мы думаем, што цяпер абласны штаб удзеліць больш увагі універсітэцкім атрадам. Абласны злёт СБА мінулага года праходзіу на базе іншых ВНУ і у саставе дэлегатау не было прадстаунікоу БДУ. Але хіба не універсітэт стаіць ля вытокау будаунічага руху?

Сёння мы маем права ставіць пытанне аб тым, каб на месцах дыслакацыі універсітэцкіх атрадау функцыяніравалі свае занальныя штабы.

Час пачаць праводзіць ва універсітэце вечары працоунай славы, злёты студэнцкіх будаунічых атрадау, на якіх бы падводзіліся вынікі сацспаборніцтвау. Гэта палепшыць прапаганду СБА, дапаможа якаснай падрыхтоуцы будаунікоу.

# ШЭФСТВУ — ЯКАСЦЬ

**(З ВЫСТУПЛЕННЯ ЧЛЕНА КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ГІСТФАКА Н. ШАЎЧЭНКІ).**

У справаздачным дакладзе сакратара камітэта камсамола БДУ сказана, што нашы студэнты шэфствуюць над 8 ГПТВ, 12 сельскімі і 18 гарадскімі школамі, створана 37 педатрадау. Усё гэта, канешне, добра, але трэба адзначыць, што ёсць тут і свае цяжкасці.

Раней праца у педатрадзе залічвалася як практыка. Цяпер жа гэта адменена. Таму неабходна неяк зацікавіць студэнтау, знайсці стымул для уцягнення іх у педатрады.

У нас практыкуюцца выезды у сельскія школы, дзе для вясковых рабят даюцца канцэрты, чытаюцца лекцыі. Але і тут ёсць недахопы: ніхто не фінансуе нашы паездкі, зрэдку толькі падшэфны калгас дасць машыну.

Я хачу унесці некаторыя прапановы па арганізацыі шэфскай працы.

1. Хацелася б, каб сельгасработы і дзейнасць СБА праходзілі у тых калгасах, дзе знаходзяцца падшэфныя школы.

2. Трэба зрабіць так, каб факультэты шэфствавалі над тымі падраздзяленнямі ГПТВ, што падыходзяць ім па профілю. На базе сваёй працы студэнты могуць пісаць кантрольныя, выконваць курсавыя і дыпломныя работы.

3. Неабходна яшчэ больш аказваць падшэфным ГПТВ дапамогу у вывучэнні прац класікау марксізму-ленінізму, правядзенні практычных і тэарэтычных семінарау.

4. Мэтазгодна прыцягваць у школы юных сельскіх рабят, каб дапамагаць ім выбраць спецыяльнасць.

5. Трэба ствараць зборныя лектарскія групы і брыгады, практыкаваць выкладанне некалькіх дысцыплін. Напрыклад, таму, хто вучыцца на матфаку, патрэбны веды па гісторыі, і гісторыкі арганізуюць адпаведныя лекцыі.

# СОНЦА Ў ЛАБАРАТОРЫІ

Закружыўся у паветры празрыстажоуты, прабіты наскрозь сонечным святлом ліст. За ім — другі, трэці... Ледзь падымецца вецер — і сыпануць яны амаль усе разам жоутым даждждом.

З Ігарам Малевічам, маладым фізікам навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем, я сустрэлася у адзін з такіх вось ясных восеньскіх дзён. Сучасны шматпавярховы будынак НДІ уразіу велічнасцю у гэтай лясістай мясцовасці Шчамысліц.

— Тут мы і працуем,— гасцінным жэстам запрасіу Ігар Аляксандравіч.

Абстаноука невялікага светлага працоунага пакоя — Ігар Аляксандравіч адмауляецца называць яго кабінетам — вельмі сціплая. Шмат часопісау, кніг...

Шлях, па якім Малевіч прыйшоу у навуку, самы звычайны. ВНУ, потым аспірантура на кафедры ядзернай фізікі фізічнага факультэта БДУ. Толькі пасля гэтага жыццё пачало пульсаваць у сваім, асабістым рытме.

Дысертацыя маладога аспіранта з Мінска зацікавіуся навуковы калектыу на чале з акадэмікам Н. Г. Басавым. І вось — Масква. Фізічны інстытут імя П. Лебедзева Акадэміі навук СССР, самы буйны навуковы цэнтр фізічных праблем у краіне. Узбуджанасць, хваляванне, цьмяныя надзеі — што ж, маладога фізіка можна было зразумець. Яго запрасілі сюды далажыць аб выніках сваіх работ і даследаванняу. Скаванасць перад масцітымі вучонымі, дауно знаёмымі па газетах, хутка прайшла, змянілася упэуненасцю у сваіх сілах, сваёй праваце. Голас стау спакойны, тон разважлівы.

Аудыторыя уважліва слухала невядомага дагэтуль аспіранта з Беларусі. Сціпласць, сур'ёзнасць, нетаропкасць — гэтыя якасці маладога чалавека прысутныя заувважылі адразу. Але што за імі? Кажуць, той не салдат, хто не марыць стаць генералам. Тады і той не вучоны, які не марыць стаць пераможцай на гарачым фронце сучаснай навукі...

Скончыушы чытаць, юнак хуценька пачау складваць паперы. Бурныя апладысменты прымусілі Малевіча падняць вочы. Зала сустрэла доброразычлівасцю: сёння ён пераможа!

Пакідаючы сталіцу, Ігар доуга яшчэ не мог супакоіцца. Пачуцці узнёсласці, натхнення, радасці: ён можа прыступіць да карпатлівай навуковай працы,ператварыць многія свае мары у рэчаіснасць.

І вось І. Малевіч — загадчык лабараторыі аналага-лічбавых метадау вымярэння у НДІ ПФП.

Праца вучонага нялёгкая. Карпатлівасць з дня у дзень, з году у год, поспехі і няудачы... Але толькі такая праца змагла даць плённыя вынікі — пяць вынаходніцтвау, якія зацверджаны Дзяржкамітэтам Савета Міністрау СССР па вынаходніцтвах, больш 40 надрукаваных навуковых прац. І яшчэ адна знамянальная для вучонага падзея. 1974 год... У газетах паведамляецца аб прысваенні кандыдату тэхнічных навук, старшаму навуковаму супрацоунiку НДІ ПФП універсітэта І. А. Малевічу звання лаурэата прэміі Ленінскага камсамола БССР.

Сардэчныя віншаванні сяброу, блізкіх, знаёмых; кветкі, усмешкі, моцныя поціскі рук.... І толькі ён адзін памятае, які цярністы быу шлях да гэтай радаснай хвіліны.

Цяпер метад гібрыдызацыі у электронным навуковым прыладабудаванні, які дазваляе з'яднаць хуткадзейнічаючыя ЭВМ і метады годнасці звышвысокачастотнай тэхнікі, выпрацаваны кандыдатам тэхнічных навук І. А. Малевічам, абаронены аутарскім пасведчаннем. Іменна гэты метад дазваляе атрымліваць найвышэйшую дакладнасць пры аналізе фізічных працэсау.

У прасторным калідоры гулка адаваліся нашы крокі.

Лабараторыя уразіла мноствам прылад: на сталах, шафах, нават, на падлозе.

— Да з'езда партыі мы рыхтуем дзве прылады на ВДНГ БССР, — растлумачыу Малевіч.

Дрыжэлі стрэлкі канструкцый, мільгалі каляровыя лямпачкі. Адзін з лабарантау схіліуся над паяльнікам.

Размова зайшла пра фізічныя праблемы.

— Над кожнай з іх, — жартауліва гаворыць Ігар Аляксандравіч, — можна працаваць па 200 гадоу, а то і больш.

Усміхнууся і зноу стау сур'ёзным, спакойным.

Так і жыве у Мінску разважлівы, сціплы чалавек. Калі прыглядзецца, можна заувважыць, што позірк у яго задуменны, ды яшчэ ёсць нейкая паглыбленасць у сябе, у свае думкі. А думкі яго там, у сонечнай лабараторыі...

**Т. ВОЛКАВА.**

# У ГАСЦЯХ У СЯБРОЎ

З 17 па 26 кастрычніка у сонечным Дагестане знаходзілася дэлегацыя нашага універсітэта. Дэлегацыю узначальвалі намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ па арганізацыйнай рабоце В. Гаро і старшыня праулення клуба У. Герасіменка. У саставе дэлегацыі былі самадзейныя артысты народнага ансамбля народных танцау «Крыжачок».

Беларускіх студэнтау гасцінна сустрэлі у Дагестанскім універсітэце імя У. І. Леніна. Танцоры выступілі перад моладдзю універсітэта, медыцынскага інстытута, перад працоунымі старажытнага горада Дэрбента. Яны пазнаёміліся з гісторыяй, прыроднымі багаццямі, духоунай спадчынай аутаномнай рэспублікі, наведалі вядомую Чыркейскую ГЭС, зрабілі экскурсію па сталіцы. Нашым студэнтам было вельмі цікава даведацца аб жыцці студэнцкай моладзі Дагестана, яе праблемах, камсамольскіх справах, поспехах.

**М. СВЯТЛОВА.**





Уважліва слухаюць першакурснікі аддзялення рускай мовы і літаратуры, беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта лекцыю па гісторыі СССР, якую чытае дацэнт В. Ціток.

Фота Т. ПЕТРАШКЕВІЧ.

1. Я ужо трэці год з'яуляюся старшынёй СНТ факультэта. Наша СНТ вядзе работу у двух напрамках. Па-першае, мы імкнёмся да максімальнага прыцягнення студэнтау да навуковай працы; па-другое, дабіваемся павышэння якасці навуковых работ. Нашы рабяты прынялі актыуны удзел у XXXII навуковай канферэнцыі. У ёй удзельнічала 350 студэнтау-гісторыкау. На канферэнцыі, прысвечанай 30-годдзю Перамогі савецкага народа над нямецка-фашысцкімі захопнікамі, 60 студэнтау прадставілі грунтоуныя даклады. Быу праведзены дзень навукі. У мінулым навучальным годзе 16 нашых рабят ездзілі на навуковыя канферэнцыі за межы рэспублікі. А зараз мы ужо падрыхтавалі 50 дакладау на рэспубліканскі конкурс. Нельга не адзначыць таксама і добрую, мэтанакіраваную працу навуковых студэнцкіх гурткоу: археалагічнага, псіхалагічнага, «Філосафа» і іншых.

2. Праблемы? Я лічу, што для студэнта-актывіста галоунае — выхаваць сабе змену, каб праца, пачатая табой, не прапала дарэмна. І яшчэ. Перад актывістам паустае праблема зносін з людзьмі...



**Г. ПАРТНОВА.**
*(Гістарычны факультэт).*

**І. ГАРМАШАВА.**
*(Хімічны факультэт).*

1. Працую я на хімфаку нядауна. У гэтым годзе паступіла на вячэрняе аддзяленне факультэта. Вучыцца і працаваць, канешне, цяжка, але калі праца падабаецца, гэтага не заувважаеш. У сваёй лабараторыі мы працуем над адной з важнейшых праблем народнай гаспадаркі — праблемай ачысткі сцёкавых вод метадам радыяцыі.

2. Я часта думаю: чаму нашы вечары адпачынку, сустрэчы праходзяць часам шэра, сумна? Напэуна, таму, што тут мы рэдка знаходзім цікавыя формы арганізацыі і правядзення мерапрыемствау.

**М. СЕМУКОЎ.**
*(Юрыдычны факультэт).*

1. Вопыт камсамольскай працы у мяне немалы. Намеснік сакратара камітэта камсамола факультэта па ідэалагічнай рабоце, начальнік штаба працоуных спрау — такія мае «пасады». Летам у якасці камандзіра СБА імя М. Гастэлы выязджау у Маладзечанскі раён. Калі гаварыць сумленна, мабыць, іменна працоуны семестр дау мне так многа для цяперашняй працы у камсамоле.

2. Праблема нумар адзін — вольны час. Ну, а калі гаварыць аб грамадскай працы — праблемы іншыя. Зараз, напрыклад, трэба правесці на «выдатна» падпісную кампанію.

**Адбыуся першы, арганізацыйны, пленум камітэта камсамола. Зацверджана бюро у складзе 13 чалавек. Сакратаром камітэта камсамола універсітэта выбран старшы выкладчык гістарычнага факультэта, кандыдат гістарычных навук Анатоль Апанасавіч ТОЗІК.**

**У складзе бюро камітэта камсамола новыя члены: Н. ПРЫГОДЗІЧ, адказны за шэфскую работу; Н. ШАЎЧЭНКА, адказная за сектар перапіскі і інфармацыі; Г. ЛІСОЎСКІ, адказны за ваенна-патрыятычную работу; Н. АБРАМЧУК, намеснік сакратара камітэта камсамола фізфака.**

# БАЛГАРЫЯ — У НАШЫХ СЭРЦАХ

Аблічча гэтай зямлі непауторнае. Колькі незвычайнага, цікавага бачыць той, хто упершыню прыехау сюды. На гэтай зямлі нарадзіуся Спартак, тут змагаліся за свабоду адважныя гайдукі.

У кожнага з нас, адзінаццаці рабят студэнцкай групы кафедры пауправаднікоу фізічнага факультэта, якія пад кірауніцтвам дацэнта С. Г. Мулярчыка і старшага выкладчыка А. М. Янчанкі у жніуні знаходзіліся у Балгарыі, гэта краіна надоуга застанецца у памяці.

У час тыднёвага знаходжання у балгарскай сталіцы мы займаліся у лабараторыях Сафійскага універсітэта імя К. Ахрыдскага. Затым наведалі Плоудзіу. Пабывалі у прыморскіх гарадах — Варне, Бургасе, Сонечным Беразе.

Незабыунымі засталіся сустрэчы са студэнтамі, якія гэтым летам былі у Мінску. Яны дапамаглі нам бліжэй пазнаёміцца з гісторыяй Балгарыі, яе памятнымі мясцінамі. Нам запомніліся туманныя абрысы лясоу пры пад'ёме на гару Вітошу, каля падножжа якой раскінулася Сафія, прыгажосць горных пераналау каля Малёвіцы.

Нам пашчасціла быць у Археалагічным музеі і Нацыянальнай мастацкай галерэі у Сафіі, у Доме мастакоу і у Этнаграфічным музеі у Плоудзіве.

У Балгарыі мноства архітэктурных помнікау. Нам асабліва спадабауся храм-помнік «Аляксандр Неускі» у сталіцы і Рыльскі манастыр, заснаваны у 946 годзе.

За 20 дзён нашага знаходжання у Балгарыі мы паспелі пазнаёміцца з яе нацыянальнымі традыцыямі.

Кожны, хто прыязджае у Балгарыю, бачыць здзіуляючую прыгажосць гэтай зямлі, адчувае прыветлівасць яе людзей. Ва усіх нашых сустрэчах з балгарамі адчувалася вялікая сімпатыя да Савецкага Саюза і савецкіх людзей. Мы набылі новых сяброу, нашы сувязі працягваюцца у перапісцы. Хочацца, каб яны былі замацаваны у новых узаемных паездках нашых і балгарскіх студэнтау.

**К. СТАЛЯРЧУК,**
**студэнт IV курса фізфака.**

# ТРЫ ПІСЬМЫ

**Пісьмы... З дня прыезду студэнцкіх будаунічых атрадау на поунач Томскай вобласці штодзень тысячы блакітных канвертау адвозілі верталёты на «Вялікую зямлю».**

**Што у іх? Рамантыка новых дарог ці тужлівае расчараванне? Несур'ёзныя развагі часовага рабочага альбо гордая заклапочанасць гаспадара? Аб чым пісалі студэнты дамоу?**

**Рэдакцыя прапануе чытачам тры допісы байца занальнага студэнцкага будаунічага атрада «Радзіма» Ігната А.**

## МАЦІ

**10 ліпеня 1975 г., Стрэжавы.**

Дарагая матуля! Толькі заплюшчу вочы, як бачу наш старэнькі двор і цябе. Абапершыся аб бярозу, ты доуга глядзіш з-пад далоні удалячынь бальшака: ці не збочыць якая мімаходка да нашых варот? Ты чакаеш мяне. Вось ужо трэцяе лета чакаеш мяне дахаты у верасні.

Мілая мама! Я падзяляю тваю трывогу, але зразумей: будаунічы атрад — што горны паток: аднойчы пусціушыся уплау, доуга імчыш па плыні. Вось і я, даруй мне, не мог застацца дома і гэтае лета. Ты казала: «Дзеці — галубы: выраслі і разляцеліся па свету кожны на сваё месца». Я — на сваім месцы, там, дзе патрэбны.

І не хвалюйся за мяне, мама. Уладкаваліся мы нядрэнна. Твая прауда, прачынаемся на золку. Яно так, у пагодныя дні у палатцы млосна, а у непагадзь даволі сыра і дрыготна. Ты маеш рацыю: замест любімага снедання — штодзень адвечная каша. Але, мама, затое ёсць сур'ёзная неабходнасць у маіх руках. Ды ці шмат хто з нашага брата-студэнта можа выхваляцца, што усё лета пражыу у палатцы і кожны дзень сустракау маляунічы сібірскі ранак, што за лета яму пастаулена у залікоуку 20-тысячнае «дзякуй» стрэжаучан-сібіракоу!

Не, што ні кажы, а я задаволены сваім становішчам, і ты адчуваеш гэта. Дзякуй табе, матулька, за разуменне і клопаты твае!

Твой сын Ігнат.

## АДНАКУРСНІКУ

**1 жніуня 1975 г., Стрэжавы.**

...Што сказаць табе, стары? Пад пауднёвым сонцам не вельмі весела будзе чытаць табе пра камароу ды мошак. Ды і пісаць аб гэтым занадта банальна: тут камароу гэтых значна менш, чым пісьмау аб іх. У супрацьлегласць твайму «абломаускаму існаванню» перакажу свой спартанскі працоуны дзень.

Раніца. Гэта самае цікавае з усіх дзённых падзей. Чаму? А таму, што раніцай заусёды прыемна разважаць: трапіу бы ці не ботам... у камандзіра, які так лемантуе: «Пад'ём!», нібыта перад ім атрад глухіх. Потым, цікава: ці заувaжыць камандзір, што ты усё яшчэ спіпі, хоць і добрасумленна вытарашчыу вочы і заузята нацягваеш вопратку.

Абед, як і вячэра, менш прываблівы. Я нават станаулюся злосны на свой... страунік. Так і хочацца кінуць яму галодны выклік нашага атраднага песіміста: «Усё жыццё працуй на цябе, утроба!»

А адбой?! Гэта наогул памылковы пункт статуса атраднага жыцця. Мяркуй сам: «Пайшоу бы ты, Ігнат, на танцы. Праспіш так усё жыццё. А не, дык ідзі паграй ля начнога вогнішча на гітары, га?» Не-не, ты кладзешся спаць, ты адданы новай раніцы, бо яна самая цікавая!

Вось так і жыву, стары. Увесь астатні час — праца. І тут давай гаварыць сур'ёзна.

Адразу скажу: мне вельмі не спадабауся твой выраз — «ірвеце там...». Лухта! Мы працуем, стары, і працуем сумленна. Хутка і якасна. І не за грошы, павер. А таму, што людзям тэрмінова патрэбны жыллё, кінатэатры, новыя дарогі. Таму, што два кароткія летнія месяцы тутэйшага суровага краю — надта каштоуная льгота, каб не выкарыстаць яе неадкладна і па прызначэнню — будаваць. Кожны новы дом тут — сапрауднае свята для сібіракоу. А грошы... Грошы нам плацяць за працу.

Вось так, стары! Калі будзе магчымасць пасля заканчэння інстытута прыехаць сюды, дык першым буду я. Таму што я — будаунік!

Бывай! Ігнат.

## КАХАНАЙ

**20 жніуня 1975 г., Стрэжавы.**

Дзякуй табе за пісьмо, за цёплыя словы твае дзякуй! Я чытау яго мноства разоу, і зараз яно са мною, вось тут, каля сэрца.

Твой ліст... У ім — ты. Рамантычная і пяшчотная, ласкавая і прыгожая, таямнічая і няулоуная. У тайзе, адзін, схаваушыся пад маёю лістоуніцай, я перачытвау яго яшчэ і яшчэ, і зноу здавалася, што ты побач, дзесьці тут, напэуна, вунь за тым кедрам. Я спяшауся да цябе, а знаходзіу нямое маучанне і пустэчу; толькі залацістыя кроплі смалы, што слёзы, бязгучна каціліся у траву. Але ж ты была, ты дзесьці побач, ты штосьці шаптала, штосьці гарэзліва шаптала, і я шукау, шукау, каб расказаць пра свой боль, каб пранесці цябе на руках над тайгою у блакітную бязмежнасць, каб яшчэ раз сказаць: «Я кахаю цябе, чуеш, кахаю!»

Ніхто не вінаваты у тым, што мы прыносім турботы адзін другому. Мы дастаткова былі разам, каб жыць зараз успамінамі аб нашых рамонках. Хай будзе усё неспакойным! Насуперак усім турботам мы будзем па-ранейшаму любіць і чакаць.

Да хуткай сустрэчы!

Ігнат.

**З дазволу аутара пісьмы падрыхтавау да друку Генадзь МАРОЗАЎ.**

Стрэжавы — Мінск.

## ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ





Восеньскае святло.

Фота В. КОВЕЛЬ.

Прэабражэнская царкава ў г. п. Заслаўль.

Фота А. БАСАВА.

УНІВЕРСІТЭТУ — ЧЫСТАЕ ПАВЕТРА

## ДЫМ ТВАІХ ЦЫГАРЭТ

**Гаворыць намеснік міністра аховы здароуя СССР, прафесар, доктар медыцынскіх навук Е. Ч. НОВІКАВА:**

— Чалавек, які скурвае штодзённа па 20 цыгарэт, у сярэднім жыве на пяць гадоу менш за таго, хто не курыць. Скурвае у два разы болей — аднімае ў сябе яшчэ тры гады жыцця.

Мне, як урачу-педыятру, хацелася б падкрэсліць, што нярэдка людзі, якія кураць на рабоце, у сталовых, кафэ, цягніках, не улічваюць, што побач з імі знаходзяцца будучыя маці і маленькія дзеці.

Я лічу, што курэнне таксама недапушчальна і ва усіх установах, маючых якія-небудзь адносіны да дзяцей. Акрамя ж чыста медыцынскага боку справы, трэба улічваць і выхаваўчы. Як паказала даследаванне, якое было праведзена у Англіі, прыкладна палова курыльшчыкау курыць цыгарэты толькі ад пераймання, а зусім не ў выніку недадольнай цягі да курэння.

Весці барацьбу з тымі, хто курыць у грамадскіх месцах, трэба. Іншая справа — як?

— Я злосны праціўнік курэння, хаця раней і курыу, — кажа Л. У. Арлоускі, доктар медыцынскіх навук, кіраунік групы Інстытута санітарнай асветы. — Правілы агульнажыцця яшчэ часта парушаюцца. Але, акрамя курыльшчыкау, вінаваты у гэтым і мы.

Ці дастаткова ўвесці строгія меры, каб людзі не курылі на сваіх рабочых месцах і у грамадскіх установах? Баюся, што не. Усякае насілле натыкаецца на супраціўленне, калі вінаваты не разумее сваёй віны. Неабходна асвета.

**(«Неделя»).**

## УСЕСАЮЗНЫ АГЛЯД БЯСПЕКІ РУХУ

За апошнія дні кастрычніка ў Мінску зарэгістравана 30 дарожна-транспартных здарэнняу. Пяць чалавек загінула, 28 пакалечана.

Толькі за адзін дзень, 14 кастрычніка, Дзяржаунай аўтаінспекцыяй было выяулена 244 парушэнні правіл дарожнага руху вадзіцелямі аўтатранспарту. Пяць вадзіцеляў затрыманы за кіраванне транспартам у стане ап'янення.

Не прытрымліваюцца правіл руху і пешаходы. Яна ў два разы больш, чым вадзіцелі, парушаюць правілы.

У сувязі з гэтым на многіх прадпрыемствах вядзецца вялікая прапагандысцкая работа.

Кожную суботу у памяшканні Дома культуры будаунічага трэста № 1 праводзяцца заняткі па бяспецы дарожнага руху. У іх праграме — пасяджэнне камісіі па разбору парушэнняў, лекцыя, вучэбны кінафільм.

**ДАІ УУС Мінгарвыканкома.**

## АДКАЗЫ НА КРАСВОРД, НАДРУКАВАНЫ Ў НУМАРЫ ЗА 23 КАСТРЫЧНІКА

**Па гарызанталі:** 1. Азгур. 4. Сатыр. 5. Куц. 6. Ухта. 8. Меніск. 11. Акно. 13. Дэкрэт. 15. Рэмарк. 17. Кама. 19. Кайрат. 22. Азот. 25. Аір. 26. Гамер. 27. Накат.

**Па вертыкалі:** 1. Абсцэс. 2. Гётэ. 3. Рэрых. 5. Кун. 6. Уюн. 7. Акцёр. 8. Мёд. 9. «Ігрок». 10. Кат. 12. Осмій. 14. Этыка. 15. Рак. 16. Кут. 18. Аут. 20. Апарат. 21. Рур. 23. Орган. 24. Смак.

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. Аб'ём—1,5, друк. ар. АТ 05529 Заказ № 1607

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.